# Легендарная фігура

## *Да 100-годдзя з дня нараджэння дырыжора Іллі Мусіна*

***У гісторыі сусветнай музычнай культуры XX стагоддзя імя Іллі Аляксандравіча Мусіна займае асаблівае месца. Гэта сапраўды легендарная фігура ў гісторыі дырыжорскай педагогікі. Чалавек, з імем якога звязана зараджэнне і фарміраванне савецкай дырыжорскай школы, прызнанне яе дасягненняў на сусветным узроўні. Ленінградская дырыжорская школа, якую ён узначальваў у другой палове XX стагоддзя, атрымлівае міжнароднае прызнанне. У той жа час творчы лёс І.Мусіна цесна звязаны з гісторыяй музычнай культуры Беларусі, з фарміраваннем і станаўленнем айчыннага сімфанічнага выканальніцтва.***

Вячаслаў БАРТНОЎСКІ

Дзіцячыя і юнацкія гады Мусіна прайшлі ў Кастраме, ціхім правінцыйным горадзе на Волзе, у сям'і гадзіннікавых спраў майстра. Вынікі пачатковых заняткаў музыкай (ігра на скрыпцы, затым на фартэпіяна) мелі вельмі сціплы характар. Тым не менш у 1919 годзе ён з'ехаў у Петраград і паступіў у кансерваторыю (у клас фартэпіяна А.Дубасава). Прыехаўшы ў паўночную сталіцу з глухой правінцыі, Мусін з галавой акунаецца ў музычны свет, наведвае аркестравыя рэпетыцыі, канцэрты, спектаклі. У выніку заняткаў у складаных побытавых умовах (у неацяпляльных памяшканнях) малады піяніст "пераігрывае" левую руку. Гэта вымушае Мусіна адмовіцца ад кар'еры піяніста і шукаць новы шлях да рэалізацыі сваіх творчых амбіцый. У 1924 годзе ён паступае на тэарэтыка-кампазітарскае аддзяленне Ленінградскай кансерваторыі, а ў 1925 годзе становіцца студэнтам упершыню арганізаванага ў Ленінградскай кансерваторыі оперна-сімфанічнага аддзялення (клас дырыжыравання М.Малько, затым А.Гаука).

Паралельна з вучобай Мусін пачынае працаваць у якасці піяніста і дырыжора ў Вялікім драматычным тэатры (1926 – 1929). У 1929 годзе яго запрашаюць весці клас дырыжыравання і аркестравы клас у Цэнтральным педагагічным тэхнікуме (1929 – 1937). У 1931 годзе, пасля заканчэння кансерваторыі, Мусін атрымлівае запрашэнне весці клас дырыжыравання і кіраваць аркестравым класам у Ленінградскай кансерваторыі.

Педагагічная праца ў дырыжорскім класе і ў опернай студыі кансерваторыі, а таксама заняткі з аркестрам сталі для маладога музыканта выдатнай школай, якая аказала вельмі значны ўплыў на развіццё і фарміраванне яго педагагічных прынцыпаў.

У 1937 годзе Мусін прымае прапанову ўзначаліць сімфанічны аркестр Беларускай філармоніі і адначасова быць прафесарам Мінскай кансерваторыі (1937 – 1941). Наступныя чатыры сезоны былі напоўнены вялікай арганізатарскай і творчай працай з маладым калектывам, які яшчэ толькі пачынаў свой творчы шлях. Нараўне з вялікай колькасцю класічных твораў значнае месца ў рэпертуары аркестра сталі займаць творы савецкіх кампазітараў (Д.Шастаковіча, Л.Кніпер, Д.Кабалеўскага, М.Мяскоўскага). Вялікая ўвага надавалася дырыжорам выкананню сачыненняў беларускіх аўтараў (М.Аладава, В.Залатарова, Я.Цікоцкага, А.Багатырова, М.Крошнера, П.Падкавырава, Р.Пукста і іншых).

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны прымушае Мусіна пакінуць Мінск. У Ленінградскай кансерваторыі, эвакуіраванай у Ташкент, ён узначальвае дырыжорскі і аркестравы класы.

У пасляваенны час Мусін вяртаецца ў Ленінград, дзе працягвае актыўную выканальніцкую дзейнасць у кансерваторыі, а таксама перыядычна гастралюе ў гарадах СССР (Кіславодску, Саратаве, Таліне, Навасібірску, Мінску, Вільнюсе, Адэсе, Кіеве).

У той жа час педагагічная дзейнасць Мусіна ў Ленінградскай кансерваторыі атрымлівае шырокае прызнанне. За многія гады працы ён выхаваў і падрыхтаваў звыш 100 дырыжораў. Сярод іх К.Сімяонаў, А.Дзімітрыядзі, Б.Цілес, Д.Цюлін, В.Фядотаў, А.Кац, Ю.Дамаркас, Ю.Цемірканаў, В.Чарнушэнка, В.Сінайскі, В.Гергіеў і іншыя. Каля 15-ці з іх сталі пераможцамі і лаўрэатамі ўсесаюзных і міжнародных конкурсаў дырыжораў, пазней узначалілі вядучыя творчыя калектывы.

У сярэдзіне 1980-ых гадоў ленінградская дырыжорская школа, на чале якой стаіць Ілля Мусін, атрымлівае шырокую вядомасць і прызнанне за мяжой. Да яго едуць вучыцца дырыжорскаму майстэрству з розных краін свету (Англіі, Францыі, Іспаніі, Германіі, Турцыі, Фінляндыі, краін Паўднёвай Амерыкі). Абагульнены і сістэматызаваны шматгадовы педагагічны і метадычны вопыт выкладання дырыжыравання і выхавання маладых дырыжораў знаходзіць сваё ўвасабленне ў дзвюх яго кнігах: «Тэхніка дырыжыравання» і «Аб выхаванні дырыжора». Інтэнсіўная дзейнасць Мусіна не ведала ўзроставых межаў. Пераступіўшы ўжо васьмідзесяцігадовы рубеж, Мусін неаднойчы выязджаў у розныя краіны для правядзення міжнародных майстар-класаў па дырыжыраванню (у Акадэміі Сібеліуса ў Хельсінкі, у Каралеўскай акадэміі музыкі ў Лондане, у Акадэміі Кіджана ў Сіене (Італія)).



Ілля Мусін.

Значнасць творчай і педагагічнай дзейнасці Мусіна ў гісторыі беларускай музычнай культуры велізарная. Узначаліўшы ў 1937 годзе толькі што створаны ў Мінску сімфанічны аркестр, ён планамерна ўкараняе карпатлівую індывідуальную і групавую рэпетыцыйную працу (нястомна выхоўваючы ў аркестрантаў высокую выканальніцкую і мастацкую культуру) і тым самым закладвае асновы для яго далейшага прафесійнага і творчага росту. Выдатнымі памочнікамі галоўнага дырыжора ў дасягненні пастаўленых задач, у актыўным засваенні калектывам цудоўных выканальніцкіх традыцый ленінградскай музычнай школы аказаліся і запрошаныя з Ленінграда два яго ныя вучні – К.Сімяонаў і А.Дземба. Высокія творчыя дасягненні дырыжора, які ўзначальваў калектыў, былі па заслугах ацэнены пасля правядзення ў 1940 годзе ў Маскве Першай дэкады беларускага мастацтва. Указам урада І.Мусін быў узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны" і ўдастоены звання заслужанага артыста БССР.

Творчыя кантакты Мусіна з беларускім музычным мастацтвам надалей таксама не спыняліся і ажыццяўляліся пераважна апасродкавана, праз яго вучняў. Так, на пачатку сваёй творчай дзейнасці ў Мінску, адначасова з мастацкім кіраўніцтвам сімфанічным аркестрам філармоніі, Мусін стаў прафесарам кансерваторыі, узначаліўшы сімфанічны аркестр і дырыжорскі клас. Менавіта ён стаяў ля вытокаў стварэння ў рэспубліцы прафесійных дырыжорскіх кадраў па оперна-сімфанічнай спецыяльнасці. Сярод яго першых вучняў былі М.Рыўкін, С.Ратнер, Д.Карасік, Э.Гольдберг. У далейшым "мусінскую дырыжорскую школу" ў Ленінградскай кансерваторыі прайшлі многія вядучыя беларускія дырыжоры: Ю.Яфімаў, А.Энгельбрэхт, В.Лявонаў, Д.Зубаў, А.ПаляНічка, А.Васілеўскі, М.Сянкевіч.

Пражыўшы доўгае і плённае жыццё, Мусін выхаваў не адно пакаленне прафесійных дырыжораў, абагульніў у сваіх працах больш як паўвекавы педагагічны вопыт. Адным з першых у XX стагоддзі ён заклаў падмурак навукі, прысвечанай асэнсаванню феномена дырыжорскага выканальніцтва.

*Пераклад з рускай мовы.*
*Фота з архіва аўтара артыкула.*